Ба 45717бр

А. Александровіч

Горад раніцой

Мн. 1930

инв 45717.

Б_А 45717 оф

Андрэй Александровіч

# Горад раніцой



Малюнкі Барыса Малкіна

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва

1930




25. 0 4. 2009

Ба 45717

Сёньня сонца ўстала рана,
Глянула на горад,—
Сьпяць кругом. Пазачыняны
Брамы, калідоры.




Вакяніцы ў камяніцах,
Крамы пад замкамі.
Каля плошчы сьпіць ізвозчык
З доўгімі вусамі.

Ба 45717 8б
Бел. … дзел
1994 г.

Вартаўнік капэратыву,
Седзячы на скрынцы,
Сьцеражэ тавар рупліва
Ад ліхіх злачынцаў.



І гадзіньніку ня сьпіцца
На званіцы-вежы.
Залаціцца каменіца
Сонечнай мярэжай.

Вышаў дворнік неўзабаве,
Глянуў—сонца сьвеціць.
Стаў на брук, мятлу паправіў,
Вымятае сьмецьце.



З поўгадзіны ня мінула,
І гудок фабрычны
Моцна так зазыўным гулам
На работу кліча.

**Горад радасна ўздыхае,**
**Як пасьля прымусу,**
**Строем выбеглі трамваі,**
**Ўсьлед і аўтабусы.**








Адмыкаюць крамы, вокны,
Бразгаюць засовы.
На страху пагрэцца скокнуў
Кот белагаловы.




І ня позна: толькі восем,
А ўжо шумна гэтак,
Бач, газэтчыкі разносяць
Сьвежыя газэты.



Папіросьнік з хаты вышаў
З скрынкаю сваею:
Заглядзеўся, як афішы
Ля тэатру клеюць.





Завіхаюцца кабеты
У пякарнях, крамках,
Каб хутчэй купіць для дзетак
Сьвежых абаранкаў.



Пачынаецца сьпякота,
Людзі ўсё-ж працуюць.
Спрытна хлопчык чысьціць боты
Дробнаму буржую.





Аж да вечара ад ранку
Цацкі-забаўлянкі
Маладая кітаянка
Прадае на ганку.

Вунь манцёры-слупалазы
Правяць электрычнасьць.
Гул на вуліцы адразу
Стаў, як навальнічны.



Ёсьць няшчасьці—і наўперад
Ад такіх выпадкаў
Рупна міліцыянэры
Сочаць за парадкам.




Гул на вуліцы бязьмеры,
Сонца прыпякае.
Дзеці ў трусіках па скверы
Абручы качаюць.



А над горадам канатам
Дым віецца чорны,—
Знача, новы дзень пачаты
І ў фабрычных горнах.



Тут рабочыя працуюць,
І старанна гэтак:
Долю лепшую будуюць
Для маленькіх дзетак.

1964 г.

1968

Бел. аддзел
1994 г.

ЦАНА 42 КАП.



чытайце

андрэя • александровіча

# рыбак •

# як цацкі дома зрабіць і самому

хлопчык і песень •

калыханка •

Бібліятэка БССР імя Леніна Дзяржаўная

Галоўлітбел 648 — 5000 экз.

A
Цѣна 6 ...
Аўтомат
B0000000409839